войск с белорусской земли. С того времени в память о погибших и пролитой крови этот мост стал называться «КРАСНЫМ».

Последним монументом, возведенный в честь Отечественной войны 1812 г. по плану императора Николая I, был памятник в местечке Клястицы. Его строительство велось инженер – поручиком Доморацким по типу всех памятников, созданных архитектором Антоном Адамини. Надписи на нем гласили следующее: «Сражение при Клястицах 19 июля 1812 года. Поражение Удино Графом Витгенштейном. Взято в плен неприятеля 912 человек» [4, с. 20].

26 августа 1857 г. монумент был освящен и передан Александровскому Комитету. В связи с отдаленностью от губернского центра, Министерство финансов России настояло, чтобы при памятнике постоянно находилось два сторожа. Памятник был удален от уездного центра, поэтому ни особого присмотра, ни необходимого регулярного ремонта за ним не осуществлялось. Лишь к столетнему юбилею памятник был приведен в порядок [2]. В советские годы памятник постигла та же участь, что и памятник в г. Полоцке. «В 1930 годы был снесен памятник такого же устройства в м. Клястицы Россонского района в честь победы над французами 19 июня 1812 г.» [4, с. 47]. Впоследствии памятник восстановлен не был. Но вместо него в 1962 году в центре деревни установлена стела в честь 150-летия победы русских войск в сражении под Клястицами, которую сменил в конце 1980-х годов скромный мемориал [4, с. 19].

Память о войне 1812 года хранит так же мемориальный знак в деревне Жарцы. Это одно из мест зарождения партизанского движения 1812 года на территории Беларуси. Знак установлен в 1986 году [5, с. 667] в честь партизанского отряда Максима Маркова.

Многое из истории памятников в честь событий Отечественной войны 1812 года на Полотчине сегодня еще не известно. Иногда даже возникают трудности в определении даты установки того или иного памятника. Но нельзя строить счастливое и справедливое будущее без знания своего прошлого. Обычно история за это наказывает.

1. Протоколы № 6–8 заседаний исполнительного комитета городского Совета депутатов трудящихся. Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Ф. 658. – Оп. 6. – Д. 355.
2. Малышкин, С. Отечественная война 1812 г. Памятники Отечественной войны на территории Полоцка и его уезда / С. Малышкин // Коммунар-пресс [Электронный ресурс]. – 09.12.2011. – Режим доступа: http:// kommunar-press.ru/content/view/2574/36/. – Дата доступа: 12.01.2012.
3. Отечественная война 1812 г. и Российская провинция в событиях человеческих судеб и музейных коллекциях. – Малоярославец, 2010. – 300 с.
4. Памятник в воспоминания сражений при Полоцке в 1812 году/сост. Судник А.И. – Полоцк: Полоцк. кн. изд-во, 2010. – 64 с.
5. Память. Полоцкі раен. – Мінск: Вышэйшая школа, 1999. – 700 с.
6. Рапорт, П.Х. Витгенштейна Александру 1…№ 285 / П.Х. Рапорт // Народное ополчение в Отечественной войне 1812 года. – М., 1962. – С. 306–307.
7. Словарь русских генералов, участников боевых действий против армии Наполеона Бонапарта в 1812–1815 гг. // Российский архив. – Т.VII – М.: Студия «ТРИТЭ» Н. Михалкова, 1996. – С. 439.

**В.Ю. Бароўка**

## ПАДЗЕІ ВАЙНЫ 1812 ГОДА Ў ІНТЭРПРЭТАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ ПРАЗАІКАЎ

Вайна 1812 года не часта станавілася прадметам мастацкага ўвасаблення ў беларускай прозе. Адна з першых спроб аповеду пра яе – кароткі эпізод у кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (1844–1846), дзе па экстралітаратурных прычынах у сімваліка-алегарычным плане беларуска-польскім аўтарам гаварылася пра крывавую бітву пад



Репозиторий ВГУ

Клясціцамі: “Гэта бура ў Клясціцах, на Пецярбурскім гасцінцы; з далёкіх краёў прыйшла яна сюды, сеючы свінцовым градам; дарэмна імкне на поўнач: там моцныя вятры і маразы спаткаюць яе” [1, с. 136–137].

Амаль праз сто гадоў пасля Яна Баршчэўскага да мастацкага асэнсавання вайны 1812 года звярнуўся беспадстаўна рэпрэсаваны Барыс Мікуліч. Падзеі ў яго аповесці “Адвечнае” (1947 г., але надрукавана толькі ў 1972 г.) пачынаюцца восенню 1811 года, калі Напалеон вядзе падрыхтоўку да вайны з Расіяй, калі частка польскага грамадства выношвае планы адрадзіць Рэч Паспалітую на чале з князем Панятоўскім. Актыўнымі арганізатарамі прапольскіх сіл на беларускай зямлі ў творы, як і ў знакамітай паэме “Пан Тадэвуш” Адама Міцкевіча, паказаны каталіцкія манахі. Адзін з галоўных герояў аповесці купец Казімір Руткоўскі перакананы, што народ не падтрымае ні Напалеона, ні Панятоўскага, хоць і шмат напакутаваўся ад рускага цара. Шляхта і манахі мараць пра перамогу Напалеона над Аляксандрам I. Яны ўпэўнены, што надышоў час дастаць сцягі, пад якімі продкі некалі змагаліся на Грунвальдскім полі. У трактоўцы Мікуліча, пазіцыя арыстакратаў неадназначная. Так, граф Тэадор Тышкевіч баіцца падтрымліваць французаў, каб не пазбавіцца маёмасці, а яго жонка, жорсткая прыгонніца, гатова па першаму закліку стаць пад штандары Панятоўскага. Аўтар падкрэсліваў непапулярны ва ўсіх пластах грамадства саюз Расіі і Францыі, згадваў пра каланіяльную блакаду Англіі, пра грунтоўную падрыхтоўку Напалеона да вайны, пра перанасычанасць расійскіх прастораў напярэдадні вайны французскімі шпіёнамі. Паведамленне пра пераход граніцы французамі стылёва блізкае да “Вайны і міра” Льва Талстога: “Дваццаць чацвёртага чэрвеня 1812 года “Grande armee” Напалеона рушыла праз Нёман. Першымі ступілі на літоўскія і беларускія землі палякі. Гэта была своеасаблівая дэманстрацыя, прыдуманая для таго, каб апраўдаць перад гісторыяй, мусіць, вераломны напад на славянскія землі “вызваленнем Польшчы з-пад прыгнёту рускага цара”. Частка палякаў 13 палка загінула ў хвалях вялікай ракі, і яны, гэтыя загінуўшыя, былі самымі шчаслівымі ўдзельнікамі “рускага паходу”, бо загінулі яны з надзеяй” [2, с. 130]. Пачатак эпічнай і панарамнай па характару аповесці “Адвечнае” дае падставы сцвярджаць, што Мікуліч пры ўзнаўленні падзей 1812 года абапіраўся не толькі на гістарычныя факты, мастацкі вымысел, але і на эстэтычны вопыт аўтараў “Пана Тадэвуша” і “Вайны і міра” ў паказе грамадскай сітуацыі таго часу.

Напалеон, паводле беларускага празаіка, разлічваў, што яго саюзнікамі стануць шляхта і прыгоннае сялянства, аднак вельмі хутка сяляне зразумелі, што захопнік “яшчэ горш паноў бярэ ўсё, што трапіць” [2, с. 147]. Шляхціцы таксама ўбачылі, што французы кіруюцца толькі сваімі інтарэсамі. Так, Вітольд Радзівіл-Сасноўскі апрануў французскі мундзір, каб змагацца за сваю Айчыну, але ў спадчынным маёнтку ваяўнічы напалеонаўскі капрал забіў яго за зробленую таму заўвагу. Ва ўмовах вайны прыгонныя сяляне сталі абаронцамі роднай зямлі і ўласных сем’яў. Б. Мікуліч згадваў пра разгортванне партызанскіх дзеянняў, пра камандзіраў рускіх партызанскіх атрадаў Давыдава, Сяславіна, Фігнера. Пісьменнік акцэнтаваў увагу на тым, што рускае апалчэнне атрымала зброю ад царскіх улад, а “на Беларусі, дзе большасць земляў і сялян належала польскім панам, сяляне не атрымалі зброю з рук паноў, улады, бурмістраў – яны самі ўзялі яе” [2, с. 175]. Мікуліч вельмі падрабязна, амаль з дакументальнай дакладнасцю, расказваў пра адступленне Напалеона па тэрыторыі Беларусі: “6 лістапада асноўныя часткі адступаючай напалеонаўскай арміі дасяглі Оршы” [2, с. 184]; “Адмірал Чычагоў з 30 тысячамі авалодаў пераправай ля Барысава і часткова перакінуўся на левы бераз ракі” [2, с. 185]. Пісьменнік у схематызаваным мастацка-публіцыстычным



Рэпазіторый ВДУ

стылі свайго часу ахарактарызаваў і вынікі ваеннай кампаніі 1812 года: “Вайна ўскалыхнула народныя масы. Аднак надзеі іхнія на вызваленне не апраўдаліся. Рушыўшы ў кінутыя перад вайной маёнткі, абшарнікі перш за ўсё паклапаціліся аб раззбраенні апалчэння, партызан, мужыкоў. Раб са стрэльбай у руках пераставаў быць рабом. Аднак надзея – гэта кветка, што квітнее на жывой галіне, не вяне. Адквітнее, абсыплюцца пялёсткі, аднак жа пройдзе зіма, прыгрэе веснавое сонца – і кветка зноў гарыць прывабным агнём-цветам” [2, с. 188].

Аповесць Б. Мікуліча – спроба адлюстраваць падзеі Айчыннай вайны і праз іх асэнсаваць сітуацыі Вялікай Айчыннай вайны, акцэнтаваць вальналюбства як дамінантную рысу народнага характару. У аповесці відавочныя адступленні ад гістарычных фактаў, бо аўтар нагадаў пра суперніцтва Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага за ўвагу Напалеона. Насамрэч, згодна з Тыльзіцкім мірам 1807 года, Напалеон стварыў васальнае Герцагства Варшаўскае, а ў захопленай Вільні Напалеон загадаў стварыць Часовы ўрад – Камісію Вялікага княства Літоўскага, паўнамоцтвы якой распаўсюджваліся на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую, Беластоцкую губерніі, дзе былі ўтвораны дэпартаменты, якія павінны былі ва ўсім дапамагаць напалеонаўскай арміі.

Невялікая па памерах аповесць “Сны імператара” (1990) Уладзіміра Арлова пабудавана ў форме плыні думак Напалеона, сасланага на востраў святой Алены, дзе ён прыгадваў 1812 год. У. Арлоў супастаўляў уваход Напалеона ў Вільню і ў Віцебск. Перад патрыятычна настроенымі віленцамі 28 чэрвеня 1812 года французскі імператар заявіў: “На вашым месцы я думаў бы і рабіў, як вы, бо любоў да Айчыны – галоўная дабрачыннасць адукаванага чалавека. У маім становішчы даводзіцца лічыцца з мноствам інтарэсаў і выконваць безліч абавязкаў, але, калі б я быў імператарам французаў у час падзелаў вашае Айчыны, я ўзброіў бы ўвесь мой народ, каб падтрымаць вас...” [3, с. 347]. Сабе імператар прызнаваўся, што размовы пра падтрымку незалежнасці іншых народаў для яго ўсяго толькі дыпламатычныя гульні дзеля набыцця новых прыхільнікаў. Напалеон спрабаваў выкарыстоўваць палітычныя пралікі Аляксандра I на беларускіх землях: “Аляксандр спрыяў тут развіццю польскай адукаванасці і польскага характару дзяржаўнага жыцця і – нястомна разбураў гэты парадак сваімі ўказамі і загадамі. Пад уплывам фаварытаў цар увесь час вагаўся, быццам маятнік, – ад думкі аднавіць Вялікае княства Літоўскае да ідэі канчаткова ператварыць яго ў расейскую правінцыю” [3, с. 348]; “Дзяржаўныя падаткі збіралі тут, у адрозненне ад усёй імперыі, толькі ў звонкай манеце, і гэта пры курсе, калі 100 папяровых рублёў, роўныя 22 срэбным. Плаціць асігнацыямі дазволена толькі летась. А калі сюды дадаць яшчэ колькі спусташальных паходаў расейскіх войскаў і немагчымасць пасля Тыльзіцкага міру вывозіць збожжа ў Англію...

Апрача таго, кожныя восем з дзесяці жыхароў краіны – грэка-каталікі, якіх Пецярбург пачынае пераганяць у праваслаўе, каб адабраць магчымасць гаварыць з Богам на сваёй мове і хутчэй зрабіць у душы расейцамі. На гэты конт ён, імператар, выдасць адмысловы ўказ. Ён памятае, што ўніяцкія святары не чыталі ў сваіх храмах пасланне расейскага сінода, дзе з падказкі царскага двара яго, Напалеона, абвяшчалі папярэднікам Антыхрыста” [3, с. 349]. Напалеон лічыў сваю стратэгію правільнай: “Ён прыйшоў сюды як вызваліцель і за абяцанне аднавіць Вялікае княства атрымае не толькі правіянт і фураж, але і стотысячнае войска, якое Агінскі дакляраваў імператару Аляксандру” [3, с. 350]. Але ён быў вымушаны затрымацца ў Вільні, каб здабыць войску прыпасы, Часовы ўрад Княства не спяшаўся выконваць свае абавязкі, беларуская зямля не дала яму сто тысяч валанцёраў для паходу ўглыб Расіі. Напалеон іранічна каменціраваў ахвяраванні бела-

Рэпазіторый ВДУ

русаў на Вялікую армію: “Нейкі наваградскі шляхціч не пашкадаваў на шапкі французскім сапёрам ажно цэлае футра з сібірскага мядзведзя. Які чуллівы клопат пра вызваленне Бацькаўшчыны! Ад князёўны Радзівіл атрымана 30 бочак мукі, 2 – крупаў, 10 валоў, 12 бараноў. І гэта найбагацейшы род, пра які склалі прымаўку: кароль у Варшаве, а Радзівіл у Нясвіжы. Кажуць адзін з Радзівілаў калісьці купіў у Парыжы перад сваім домам цэлы квартал, а потым загадаў гэты квартал знесці – каб не блукалі ўначы, ідучы ў суседнюю цукроўню па ўлюбёныя княжыя цестачкі, ягоныя пахолкі. 2 бочкі крупаў... Гонар роду ратуе князь Дамінік, які забяспечыў зброяй і рыштункам увесь свой полк. 12 бараноў... А вось яшчэ адно шчодрае ахвяраванне вызваліцелям: рэшата яек і тры фунты масла. І пра такую шчодрасць яны яшчэ адважваюцца пісаць у газетах!” [3, с. 353]. Маладая жанчына ў белым, якая прыйшла прасіць да Напалеона паспрыяць незалежнасці яе Радзімы, папярэдзіла імператара, што большасць дваран, асабліва ў правінцыі, абыякавыя да грамадскіх спраў: “Гэтыя людзі хочуць толькі, каб іх не чапалі, не вельмі залазілі ў гаманцы, не адбіралі звычных правоў, а хто і што пануе ў краіне – ім амаль абыякава” [2, с. 355]. Французскі імператар паабяцаў, што закончыць кампанію ў Менску і Смаленску, умацуе заваяваныя гарады і вернецца ў Вільню, каб узімку заняцца праблемамі гэтага краю, даць яму незалежнасць: “Я не перайду Дзвіны. Прысягаю вам. Ісці сёлета далей – тое самае, што самахоць ісці насустрач гібелі...” [3, с. 355].

Імператар не стрымаў свайго слова. Напалеон накіраваўся ў Віцебск, дзе спыніўся ў палацавых апартаментах на беразе Дзвіны, якія ў 1811 годзе спецыяльна падрыхтавалі для герцага Аляксандра Вюртэмбергскага, прызначанага Аляксандрам І губернатарам дзвюх губерняў. Калі Напалеон заняў Віцебск, то пераконваў сябе, што ваенная кампанія скончана. У жніўні 1812 года ніхто ў Віцебску не сустракаў французскае войска з кветкамі. Напалеон загадаў умацоўваць горад, да хрысціянскіх святынь захопнікі паставіліся непаважліва і надзвычай прагматычна: “На вуліцах выраслі барыкады з гостраканечным частаколам і землянымі валамі. За ракой, у царкве святога Сімяона, ён паставіў гарматы, ператварыўшы вокны храма ў амбразуры, Дзвіну перасеклі тры масты. На пляцы перад домам дваранскага сходу і ў самім доме зладзілі хлебныя печы. Успенскі сабор ён ператварыў у шпіталь, царкву Уваскрэсення на рынку – у склад сена і саломы. Кляштар бернардынцаў стаў правіянцкім складам, і яшчэ адзін храм Уваскрэсення – млынам, а старая Барысаглебская царква, што самотна стаяла над Дзвіною, – парахавым сховішчам” [3, с. 365].

У Вільні імператар любіў сустракацца з месцічамі, а ў Віцебску Напалеон адмовіўся ад конных паездак па горадзе, бо стаміўся слухаць скаргі месцічаў на самавольства яго салдат. Аднойчы ён зайшоў у дом да месціча: “Гаспадарам, сапраўды, цяжка было пазайздросціць. На фартэпіяна стаялі рондалі, гаршкі і патэльні. Сад быў ператвораны ў стайню і пашу. Не ўважаючы на поўную дрывотню, жаўнеры ламалі на дровы згароду, секлі ў пакоях мэблю. У гасцёўні, калі ён убачыў паміж фамільнымі партрэтамі развешаныя на сценах кавалкі сырога мяса, яго ледзь не званітавала. Зрэшты, на вайне, як на вайне” [3, с. 363]. Ход баявых дзеянняў на тэрыторыі сучаснай Беларусі аўтар узнаўляў праз успаміны Напалеона. Тым самым У. Арлоў падкрэсліваў абазнанасць імператара ў сітуацыі, якая складвалася на франтах: “Армія Тармасава разбіла пад Кобрынам яго саксонскі корпус, а Баграціён паспеў перавесці свае дывізіі на левы бераг Дняпра. Яму не ўдалося ўцягнуць у вялікую пагібельную бітву Барклая дэ Толі. Барклай здолеў трыма дывізіямі спыніць ягоны 25-тысячны авангард каля мястэчка Астроўна. Тры дні ад раніцы да вечара ішлі несупынныя баі. Тры дні ён амаль не сы-

Рэпазіторый ВДУ

ходзіў з каня, не спыняючыся ні ў вёсках, ні ў шляхецкіх дамах. На дзесяці вёрстах шляху ад Астроўна да Лучосы забітыя ці параненыя ляжалі на кожным метры, але расейскай арміі ўсё ж удалося адарвацца <...> Не самыя ўсцешлівыя рэляцыі прыходзяць і з Полацка. Днямі пад Клясціцамі расейскі корпус Вітгенштэйна сустрэўся з Удзіно. У Вітгенштэйна было 17 тысяч войска і 108 гарматаў, Удзіно меў 29 тысяч і 114 гарматаў. Яго маршал, наступаючы па Пецярбургскім тракце на поўнач, заняў Клясціцы, аднак расейцы на чале з Якавам Кульнёвым контратакавалі і праз дзень вярнулі вёску сабе. Гэта былі тыя самыя гарадзенскія лейбгвардзейцы, якіх яшчэ ў 1807 годзе ягоныя жаўнеры з павагай і страхам празвалі "сінімі гусарамі" <…> Тым часам маруду Макдональда як быццам нейкія чары прыкавалі да Дынабурга" [3, с. 365–366]. Напалеон, у трактоўцы Арлова, – чалавек, пераканаы ў сваёй выключнасці і апантаны прагай славы, які верыць у сваю шчаслівую зорку, нават насуперак абставінам. Так, падчас адступлення ў Смаргоні ён думаў пра новы пераможны паход на Расію.

Вядомы нямецкі пісьменнік Л. Фейхтвангер заўважыў: "Я не магу паверыць, што сур'ёзны раманіст, які працуе над гістарычным сюжэтам, бачыць у гістарычных фактах нешта іншае, акрамя сродку стварыць перспектыву, акрамя алегорыі, якая дапамагае нам як мага праўдзівей перадаць уласную эпоху, уласную карціну свету" [4, с. 575]. У літаратурным творы, сапраўды, гістарычны матэрыял – сродак для фарміравання і ўвасаблення пісьменніцкай канцэпцыі пэўнай гістарычнай з'явы ці сваёй эпохі. Аповесць "Адвечнае" Б. Мікуліча стала ўвасабленнем роздуму пісьменніка над лёсам народа ў складаных жыццёвых абставінах, над шляхамі барацьбы за волю. "Сны імператара" У. Арлова – твор не столькі ўласна пра ваенную кампанію 1812 года, колькі пра псіхалогію, паводзіны чалавека, надзеленага вялікай уладай, пра суадносіны палітыкі і маралі, мэты і сродкаў барацьбы, абраных для вырашэння мэты.

1. Баршчэўскі, Я. Творы. / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.
2. Мікуліч, Б. Адвечнае: аповесць / Б. Мікуліч // Полымя. – 1972. – № 8. – С. 88–92.
3. Арлоў, У. Сны імператара: аповесці, апавяданні, эсэ. / У. Арлоў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 383 с.
4. Фейхтвангер, Л. Собр. соч.: в 12 т. / Л. Фейхтвангер. – М.: Худож. лит., 1968. – Т. 12. – 689 с.

**А.І. Смолік**

## АДЛЮСТРАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВАЙНЫ 1812 ГОДА НА БЕЛАРУСІ Ў ТВОРЧАСЦІ ПЕТЭРА ХЕСА

У айчынным і еўрапейскім батальным жывапісу франка-расійская вайна 1812-1813 гг. знайшла ўсебаковае ўвасабленне. Беларускімі мастакамі напісана шмат твораў, у якіх ўвасоблены важнейшыя падзеі вайна. Так, Ян Дамель стварыў некалькі шырокавядомых карцін на дадзеную тэматыку: "Напалеон на бівауку пад Аўстэрліцам", "Разбітыя войскі Напалеона на плошчы ратушы ў Вільні", "Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.". Тэафілу Кіслінгу належыць карціна "Сустрэча Аляксандра І з Напалеонам у 1807 г.". Ян Сухадольскі выказаў свае адносіны да вайны ў карціне "Трыумф Напалеона". Сярод еўрапейскіх мастакоў XIX ст., якія прысвяцілі сваю творчасць бляску зброі, сутыкненню тысячных армій, трагічным калізіям гэтага часу, значнае месца займае нямецкі мастак Петэр Хес. Яго пэндзалю належыць серыя з 12 карцін, у якіх адлюстраваны важнейшыя бітвы 1812-1813 гг., якія высока цаніліся ў 1840-1850-е гады. Асаблівы інтарэс яны ўяўляюць і для беларусаў, так як шэраг палотнаў адлюстроўваюць ваенныя падзеі, якія адбыліся на тэрыторыі нашай краіны.



Репозиторий ВГУ